**УДК 340**

# ЗАРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ ШЛЯХЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

***А.В. ВАЛЕЎКА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Даследуюцца асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай з акцэнтаваннем увагі на праблеме шляхецкай дэмакратыі. Разгледжана гістарычнае развіццё дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, трансфармацыя ідэі залатых шляхецкіх вольнасцей. Вызначаюцца прычыны палітычнага крызісу дзяржавы ў XVIII стагоддзі, якія тоюцца ў прынцыпах пабудовы дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай, а таксама прававым парадку ўзаемаадносін шляхты і дзяржавы. Адзначаюцца пазітыўныя бакі шляхецкай дэмакратыі ў Рэчы Паспалітай.*

***Ключавыя словы:*** *шляхецкая дэмакратыя, Рэч Паспалітая, шляхецкія вольнасці, узаемаадносіны шляхты і дзяржавы.*

Асаблівасцю гістарычнага развіцця дзяржаўнасці і прававой сістэмы Беларусі з'уляецца тое, што гэты працэс нельга назваць бесперапынным. Беларускія землі на працягу стагоддзяў уваходзілі ў склад розных дзяржаў, і гэтыя абставіны аказалі значны ўплыў на эвалюцыю беларускай дзяржаўнасці.

На працягу некалькіх стагоддзяў беларускія землі ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Гэтая дзяржава цікавіць нас сваім своеасаблівым дзяржаўным ладам, а таксама даволі высокай палітычнай і прававой культурай шляхты. Асаблівасць Рэчы Паспалітай праяўляецца ў тым, што, у адрозненні ад многіх заходнееўрапейскіх краін, дзе развіццё гаспадаркі стварыла ўмовы для ўзнікнення абсалютнай манархіі, там захоўваўся стары феадальны парадак і гэтая акалічнасць знаходзіла адлюстраванне не толькі ў гаспадарчых адносінах, але і ў сферы арганізыцыі дзяржаўнай улады.

У шэрагу літаратурных крыніц дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай акрэслены як "шляхецкая дэмакратыя" альбо "шляхецкая рэспубліка". Пры гэтым некаторыя дследчыкі (напрыклад, Юліюш Бардах) вылучаюць два этапы развіцця дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай: шляхецкая дэмакратыя і магнацкая алігархія [1, с. 169].

Каб лепш зразумець асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, а таксама адносіны шляхты да дзяржавы і да сваіх правоў, трэбы прасачыць яе гістарычнае развіццё. Рэч Паспалітая ўтварылася ў выніку ўніі дзвюх дзяржаў: Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Аб падставах і ўмовах гэтага аб'яднання шмат напісана, а мы адзначым толькі тое, што працэс кансалідацыі названых дзяржаў праходзіў на працягу дастаткова доўгага часу. Пачаўшыся з персанальнай уніі, саюз Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы трансфармаваўся ў канфедэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. Асаблівасцю гэтага дзяржаўнага ладу з'ўлялася тое, што ён пры вельмі слабай уладзе манарха больш схіляўся да дэцэнтралізацыі, што межавала з анархіяй. Гэта было выклікана рознымі прычынамі.

На пачатку існавання Рэчы Паспалітай кароль ажыццяўляў сваю ўладу разам з "сярэдняй" шляхтай і з магнатэрыяй, у якую ўваходзілі найбольш багатыя і ўплывовыя прадстаўнікі шляхецкага стану. Аднак, шматлікая сярэдняя і нават дробная шляхта заўсёды шукала шляхі для ўмацаваня свайго стану ў дзяржаве. Яны былі зацікаўлены ў пашырэнні прыгонніцкіх адносін, а таксама ў абмежаванні ўдзелу мяшчан у палітычным жыцці дзяржавы. Адным з наступстваў такой палітыкі стала ўзрастанне ролі мясцовых соймікаў. З цягам часу амаль усе мясцовыя пытанні вырашаліся на сойміках, нават вайсковыя пытанні адносіліся да іх кампетэнцыі. Больш за тое, соймікі часта ігнаравалі пастановы Вальнага сойма. Напрыклад, у 1671 годзе шляхце Берасцейскага павета на рэляцыйным сойміку паведамілі, што на сойме разглядаліся пытанні аб устанаўленні падаткаў і зборы войска, то яна, спасылаючыся на адсутнасць кворуму, не прывяла ў выкананне пастанову Вальнага сойма і адклала соймікавыя дэбаты па гэтых пытаннях.

У шляхецкага ладу Рэчы Паспалітай была таксама яшчэ адна асаблівасць – гэта роўнасць усіх прадстаўнікоў шляхетскага стану. Як адзначаў Кутшэба, гэта абумоўлена тым, што "калі ў дзяржаве фарміраваўся стан шляхты, яшчэ існавала паняцце роду" [4, с. 59]. Пасля прыняцця гербаў (што азначала прыняцце ў кола шляхты) радавыя сувязі ўзмацніліся. У склад шляхты ўваходзілі цэлыя роды, а не асабістыя сем'і. Таму шляхецкія правы і прывілеі аб'ядноўвалі эканамічна і грамадска слабых людзей, адзінай апорай якіх была прыналежнасць да таго ці іншага роду, пры гэтым шляхціцам зусім не важна было мець зямлю, каб атрымаць тытул. Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што асаблівасць польскага соцыума праяўлялася ў яго станавай структуры [5, с. 13]. Справа ў тым, што на першае месца выходзіў не маёмасны, а прававы стан чалавека. Гэта таксама з'ўлялася прычынай вялікай колькасці шляхты, якая складала 6–8% ад усяго насельніцтва [1, с. 173]. Гэтую асаблівасць польскага грамадства адзначыў Ш. Мантэск'е ў сваёй знакамітай працы: "мэта законаў Польшчы – незалежнасць кожнай асобы и вынікаючы адсюль прыгнёт усіх" [6, с. 138].

Паступова ў Рэчы Паспалітай узнікла канцэпцыя “залатой вольнасці” [7, с. 300]. Галоўнымі з гэтых вольнасцей з’яўляліся роўнасць усіх шляхцічаў перад законам (aequalitas), права на свабодную элекцыю караля (па прынцыпу viritum), права кожнага шляхціча на свабоду голасу (libera vox), права на пратэст (ius vetandi), а таксама недатыкальнасць асобы шляхціча і яго маёнтка (з 1588 г. шляхецкія сядзібы былі абаронены ад усялякіх рэвізій). Тэарэтычна шляхта мела права ледзь не на ўсё, і яе вольнасці маглі абмежаваць толькі пастановы соймаў і соймікаў. Аднак яны прымаліся той самай шляхтай. А вось без згоды шляхецкіх паслоў кароль і вялікі князь не меў права ні накладаць падаткі, ні збіраць паспалітае рушанне ці пачынаць вайну, ні выдаваць якія-небудзь іншыя ўставы, што тычыліся б шляхты. Такая сітуацыя была ўнікальнай для Еўропы таго перыяду.

Тагачасная сістэма ўяўлялася шляхце самай дасканалай, і кожная спроба нешта змяніць успрымалася як імкненне да дыктатуры. Самым вядомым ідэолагам “залатой вольнасці” стаў львоўскі кашталян Анджэй Максімільян Фрэдра (1620–1679), які ў 1660-х гадах выступіў з таленавітымі трактатамі ў яе абарону. У прыватнасці, абгрунтоўваючы перавагі традыцыйнага для Рэчы Паспалітай адзінагалоснага прынцыпу пастаноў (liberum veto), ён пісаў, што ў адваротным выпадку, калі б рашэнні прымаліся большасцю галасоў, “мноства горшых пераважыла б над меншасцю лепшых”, і краіна зазнала б яшчэ большыя шкоды [7, с. 301].

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай некаторыя аўтары вобразна параўноўвалі з хорам, у якім “гучыць не адзін толькі каралеўскі альт, а мноства "вольных" галасоў суладна падтрымліваюць адну мелодыю” [1].

У сувязі з тым, што з цягам часу “залатыя вольнасці” набылі абсалютны характар, яны ўспрымаліся як аснова ўзаемаадносін паміж шляхтай і дзяржавай. Усялякая спроба рэфармаваць усталяваны лад уяўлялася шляхце замахам на яе прывілеі і блакіравалася. Баючыся змен, шляхта лічыла, што сойм мусіць не столькі праводзіць уласную палітыку, колькі стрымліваць наваўвядзенні з боку караля. Небяспека бачылася толькі ў прыняцці новых, шкодных для тагачаснага ладу пастаноў. На практыцы найлепшым спосабам іх прадухілення стала спыненне дзейнасці сойма праз liberum veto (“вольнае не дазваляю”). Права аднаго пасла сарваць працу сойма ў часе нарады стала сімвалам шляхецкай свабоды. Пачынаючы з 1652 года, “калі гэтае права скарыстаў троцкі пасол Уладыслаў Сіцынскі (хоць зрывы соймаў здараліся і раней – у 1605, 1615, 1637 гг.), і да канца панавання Сасаў (1763 г.) болыш за палову адкрытых соймаў (фактычна 37 з 73) было сарвана” [7, с. 302].

У кантэксце гэтага шляхта вяла актыўную барацьбу з магнатэрыяй. Некаторыя каралі карысталіся гэтай барацьбой для ўмацавання сваёй улады, падтрымліваючы адзін з бакоў. Напрыклад, Жыгімонт I Стары абапіраўся на магнатаў. Шляхта пайшла супраць каралеўскай улады, учыніўшы мяцеж (так званы рокаш), які быў названы “Курынай вайной” [1, с. 171].

Яшчэ адной важнай складовай часткай шляхецкай дэмакратыі з’яўлялася права на стварэнне канфедэрацый. Пры гэтым не прызнаная каралём канфедэрацыя называлася рокашам і з’яўлялася афіцыйнай формай узброенай барацьбы супраць дзяржаўнай улады. На працягу XVII стагоддзя канфедэрацыі паўставалі ў Рэчы Паспалітай дзесяткі разоў – ці то для бунту супраць манарха і дасягнення сваіх патрабаванняў, ці для яго падтрымкі [7, с. 304]. Дамагаючыся сваіх палітычных мэт, канфедэрацыі ўцягвалі ў дзяржаўнае жыццё шырокія колы шляхты і войска. А яснавяльможныя паны апрача мноства служылай шляхты мелі прыватныя вайсковыя фармаванні, што часам былі мацнейшыя за дзяржаўную армію. Напрыклад, “слуцкі князь Геранім Фларыян Радзівіл (1715–1760) трымаў 6 тысяч рэгулярнага войска і столькі ж казакоў ды стралкоў” [7, с. 304]. У мэтах падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для сваёй арміі Радзівілы адкрылі ў Слуцку і Нясвіжы спецыяльныя кадэцкія карпусы, а брат згаданага Гераніма Фларыяна, гетман Міхаіл Казімір, заснаваў у Нясвіжы ўласную вайсковую акадэмію. Наяўнасць такой сілы ў амбітных алігархаў вяла да дэцэнтралізацыі ўлады і небяспечнага паглыблення палітычнай анархіі ў Рэчы Паспалітай [7, с. 304–305].

Магнатэрыя з цягам часу пачала займаць дамінуючае палажэнне ў дзяржаве. Паступова шляхецкая дэмакратыя пачала пераўтварацца ў магнацкую алігархію. Пры гэтым дзяржаўны лад не змяняўся. Змены адбыліся толькі ў характары дзеяння і ўзаемаадносін дзяржаўных органаў [1, с. 172]. Фарміраваліся групоўкі буйных магнатаў, якія валодалі моцным аўтарытэтам у дзяржаве. У гэтыя групоўкі ўваходзіла так званая шляхецкая кліентэла магнатаў: сярэдняя і дробная шляхта, якая знаходзілася на службе ў магнатаў. Такім чынам, новы лад адпавядаў інтарэсам амаль усёй шляхты.

На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага склалася асаблівая сітуацыя. Справа ў тым, што магнаты там заўсёды мелі перавагу над астатняй шляхтай. У аслабленай войнамі дзяржаве першыя роды Літвы і Беларусі вялі зацятую барацьбу за гегемонію ў дзяржаве. Кожны з іх быў супраць цэнтралізацыі і ўмацавання ўлады манарха, бо ўніфікацыя палітычнай сістэмы Княства паводле кароннага ўзору азначала б дэмакратызацыю парадкаў і страту магнатамі іх ранейшай улады. Багатыя магнацкія роды часта складалі апазіцыю каралеўскай уладзе. Звычайна кароль падтрымліваў адзін з родаў, які супрацьстаяў апазіцыйнаму. Напрыклад, апошні прадстаўнік дынастыі Вазаў “у супрацьстаянні з магутнымі Радзівіламі пад-

трымліваў Гасеўскіх, а потым Пацаў" [7, с. 307]. Калі ж да гегемоніі прыйшлі Пацы, дык Ян III Сабескі выставіў супраць іх Сапегаў. Але кожны падтрыманы манархам вялікі род пасля дасягнення ўлады сам станавіўся ў апазіцыю да манарха.

Вельмі добра характарызуе імкненне магнатаў павялічыць свой уплыў у дзяржаве гісторыя супрацьстаяння Кароны і роду Сапегаў, якія "дамагліся абсалютнага панавання ў Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст." [7, с. 305]. Яны заручыліся падтрымкай Аўстрыі ды Брандэнбургіі і адважваліся адкрыта выступаць супраць улады самога караля. Праз карупцыю, застрашванне, увядзенне войска ў зямлю суперніка Сапегі засяродзілі ў сваіх руках амаль усе важныя дзяржаўныя пасады: Казімір Ян быў віленскім ваяводам і гетманам (1682–1703), яго брат Бенядыкт – падскарбіем, а сынам гетмана належалі ўрады вялікага маршалка, стольніка і канюшага [7, с. 305]. Супраць гегемонаў, якія заслужылі агульную нянавісць шляхты, доўга не адважваліся выступіць ні Радзівілы, ні Пацеі з Агінскімі. Сучаснікі пісалі, што Сапегі мелі план разрыву дзяржаўнай уніі з Каронай і ўзвядзення на вялікакняскі пасад аднаго з прадстаўнікоў свайго роду. У барацьбе з імі навучаны вопытам Ян III Сабескі паставіў ужо не на магнатаў, а на шырокія колы шляхты, аднак памёр, не паспеўшы зламаць алігархіі ў Вялікім Княстве [7, с. 306].

Пасля смерці Сабескага ў час працяглага бескаралеўя (1696–1697) у Беларусі і Літве запанавала нябачнае раней бязладдзе і рэзка абвастрылася барацьба паміж Сапегамі, якія спяшаліся скарыстаць момант для ўмацавання сваіх пазіцый, і астатняй шляхтай. Да шляхты далучыліся Радзівілы, Пацеі, Вішнявецкія, Агінскія ды іншыя магнаты, і супрацьстаянне перарасло ў грамадзянскую вайну. На элекцыйным сойме ў 1696 годзе шляхта Вялікага Княства выставіла згаданы вышэй праект так званай "каэквацыі станаў" (coequatio jurium), скіраванай менавіта супраць усяўладдзя дыктатараў, бо шэраг яе пунктаў істотна абмежаваў уладу вялікага гетмана Казіміра Яна Сапегі [7, с. 306]. Прынятая соймам ухвала стала важным поспехам шляхецкага, бо канчаткова ўраўноўвала правы беларуска-літоўскага рыцарства з правамі польскай брацці, а таксама чарговым этапам уніфікацыі ладу Вялікага Княства паводле кароннай мадэлі.

На мяжы 1700–1701 гадоў быў прыняты яшчэ адзін дакумент, які фактычна змяніў праграму антысапегаўскага руху. Гэтым дакументам, падпісаным усімі лідэрамі змагання з Сапегамі, стала так званая "Віленская пастанова". У ёй абвяшчалася ўвядзенне ў ВКЛ спадчыннай абсалютнай манархіі на чале з вялікім князем Аўгустам II. "Залатыя шляхецкія вольнасці", якія дасталіся літвінам "у пасаг ад палякаў", называліся "нікчэмнымі", скасоўваліся назаўжды [7, с. 307]. Тым самым рэалізоўвалася праграма Аўгуста II аб дзяржаўным перавароце ў ВКЛ і ўстанаўленні "absolutum dominium". Аднак у дзеянне гэта пастанова ўведзена так і не была, а яе аўтары (у тым ліку і Аўгуст II) вымушаны былі ад яе публічна адмовіцца. Гэта было звязана з тым, што змянілася міжнародная сітуацыя. Пасля паражэння расійскага войска пад Нарвай на першы план выйшла пагроза з боку Швецыі. Аўгуст II страціў знешнюю падтрымку, абяцаную яму Пятром I, і быў вымушаны адмовіцца ад сваіх абсалютысцкіх планаў [7, с. 307].

Сярод асноўных прававых дакументаў, якія рэгламентавалі адносіны дзяржавы і шляхты, трэба вылучыць пагадненні, якія заключаліся паміж шляхтай і новаабраным каралём.

Паміж шляхтай і кожным новым каралём перад яго элекцыяй заключалася спецыяльная дамова, так званая pactaconventa, якая вызначала канкрэтныя абавязкі новаабранага манарха і была своеасаблівым індывідуальным кантрактам. Але разам з першай pactaconventa былі складзены і "Генрыхавы артыкулы" (назва ад імя першага элекцыйнага караля Генрыха Валуа), у якіх выкладаліся падставовыя прынцыпы шляхецкай дзяржаўнасці. Яны абавязалі караля і вялікага князя прызнаваць вольную элекцыю, захоўваць рэлігійны мір, не вырашаць пытанняў вайны і міру без сената і сойма, не праводзіць выбараў наступніка пры сваім жыцці (viventerege), склікаць звычайны сойм кожныя два гады, а таксама прадугледжвалася магчымасць правядзення надзвычайных з'ездаў шляхты. Калі шляхта лічыла, што іх правы парушаюцца, то магла адмовіцца падпарадкоўвацца каралю.

Генрыхавы артыкулы былі ўхвалены ў 1573 годзе, калі каралём Рэчы Паспалітай быў абраны анжуйскі герцаг Генрых Валуа. Пасля перамоў польскага пасольства з Генрыхам на ўрачыстай цырымоніі ў Нотр-Даме 10 верасня 1573 года ён прынёс прысягу і прыняў на сябе абавязак выконваць "Пакта канвента" і так званыя Генрыхавы артыкулы. "Пакта канвента" 1573 года насілі параўнальна вузкі і пэўны характар: "абавязанні выконваць прывілеі шляхты, скласці вечны саюз паміж Рэччу Паспалітай і Францыяй, загасіць дзяржаўныя і асабістыя абавязкі Жыгімонта-Аўгуста, умацаваць польскі флот на Балтыцы, адкрыць французскі порт для купцоў Рэчы Паспалітай, адкуль адпраўляліся судны ў Новы Свет і Александрыю, і гэтак далей" [3].

Аднак пасля смерці свайго брата Карла IX Генрых таемна збег у Францыю. Віленскі ваявода ў лісце віленскаму біскупу Валяр'яну Пратасавічу скептычна ацаніў спробы дамагчыся яго вяртання ў Польшчу: "не вернецца назад, бо там [у Францыі] absolutum dominium" [7]. Абраны каралём сяміградскі ваявода Стэфан Баторый у 1576 годзе прыняў каталіцкую веру і без адмысловых прэтэнзій падпісаў Генрыхавы артыкулы і "Пакта канвента". Гэтыя паздзеі далі шляхце Рэчы Паспалітай вялікую ўладу ў дзяржаве. Некаторыя манархі, як, напрыклад, Аўгуст III, увогуле не былі зацікаўлены ў кіраванні дзяржавай.

Такім чынам, у першай палове XVIII стагоддзя Рэч Паспалітая перажывала цяжкі палітычны і эканамічны крызіс. На наш погляд, прычынай упадку дзяржавы з'яўляецца цэлы шэраг падзей і акалічнасцей. Можна нават сцвярджаць, што многія з гэтых фактараў знаходзіліся ў сувязі паміж сабой і часам вынікалі адзін з другога. Увогуле, сам дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай прывёў да такога стану. Існаваўшы ў той час парадак вельмі ўскладняў рэфармаванне. Усялякія спробы рэформ сустракалі моцнае супраціўленне з боку шляхты. Таксама моцную падтрымку існуючаму ладу аказвалі іезуіты, у чыіх руках, у асноўным, была засяроджана адукацыя. Аднак усё гэта мела і станоўчыя моманты. Узровень палітычнай і прававой культуры шляхты быу досыць высокім. Яна актыўна ўдзельнічала ў кіраванні дзяржавай. Таксама ідэя правоў шляхты спрыяла кансалідацыі вышэйшых станаў і фарміраванню адзінай палітычнай і прававой прасторы. Увогуле, дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай нельга адназначна назваць дрэнным альбо добрым. Відавочна, што разам з негатыўнымі якасцямі было і некалькі станоўчых.

ЛІТАРАТУРА


1. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах. – М.: Изд-во "Юридическая литература", 1980. – 560 с.
2. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / А.Ф. Вішнеўскі, І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тетра-Сістемс, 2005. – 192 с.
3. Галечанка, Г. Развіццё шляхецкай дэмакратыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVIII ст. / Г. Галечанка; пер. з рус. А. Шаланда // Герольд Litherland. – 2001. – № 3. – С. 85–102.
4. Кутшеба, С. Очерк истории общественно-государственного строя Польши / С. Кутшеба; пер. с пол. и вступ. ст. Н.В. Ястребов. – СПб.: Изд-во А.С. Суворина, 1907. – 231 с.
5. Лескинен, М.В. Мифы и образы сарматизма. Истоки национальной идеологии Речи Посполитой / М.В. Лескинен. – М.: Ин-т славяноведения РАН, 2002. – 178 с.
6. Монтескье, Ш.Л. О духе законов / Ш.Л. Монтескье. – М.: Мысль, 1999. – 672 с.
7. Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.


*Паступіў 22.01.2016*

## ORIGIN AND DEVELOPMENT OF GENTRY DEMOCRACY IN THE COMMONWEALTH

***A. VALEVKO***

*The state system of the Commonwealth, with a focus on the issue of gentry democracy analyzing. Considered the historical development of the political system of the Commonwealth, the transformation of the idea of gold gentry liberties. Determine the cause of the political crisis of the state in the XVIII century, which concluded in the very principles of state power of the Commonwealth, as well as the legal order of the nobility and the state of relations. There have been positive aspects of gentry democracy in the Commonwealth.*

***Keywords:*** *gentry democracy, Commonwealth, gentry freedom, the relationship of the nobility and the state.*